**Фядорына А.І.,**
**ст. выкладчык**

# РОЛЯ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ У РАЗВІЦЦІ ПРАФЕСІЙНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

Галоўнай мэтай кантрольных работ з'яўляецца якаснае засваенне і практычнае замацаванне вывучанага праграмнага матэрыялу. Праверка іх дазваляе у дастатковай ступені меркаваць аб прафесійных здольнасцях студэнтаў-завочнікаў, таму што многія заданні такіх работ па спецыяльных дысцыплінах спрыяюць больш шырокаму азнаямленню з рознымі накірункамі дзейнасці бібліятэкі.

З мэтай вывучэння ролі кантрольных работ як сродку актывізацыі прафесійных здольнасцей студэнтаў-завочнікаў намі было праведзена анкетнае апытанне 118 студэнтаў IV курса ФЗН, што склала 70,2 працэнта ад агульнага ліку. Найбольшая колькасць студэнтаў працуюць у бібліятэках Міністэрства культуры / 55,6 % /. Радавыя работнікі /бібліятэкары, бібліёграфы, ст. бібліятэкары/ склалі 60,4 %, кіраўнікі бібліятэк і іх падраздзяленняў – 22,2 % (у іх лік уключаны і загадчыкі невялікіх бібліятэк).

29,6% рэспандэнтаў маюць працоўны стаж да пяці гадоў, 43,2% -- звыш пяці гадоў, 21,7% – звыш дзесяці гадоў /у асноўным студэнты 401 і 402 груп, якія навучаюцца пасля Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума/ , і 5,5% апытаных працоўны стаж ў анкетах не пазначылі.

На пытанне анкеты: «У якой ступені выкананне кантрольных работ па спецыяльных дысцыплінах садзейнічае вывучэнню праграмнага матэрыялу?»-- 67,2% студэнтаў адзначылі, што яно спрыяе засваенню толькі той тэмы, па якой распрацавана заданне; 22,3% адказалі, што выкананне кантрольных работ садзейнічае вывучэнню ўсяго праграмнага матэрыялу.

Для таго, каб стымуляваць чытанне вучэбнай літаратуры па асноўных пытаннях праграмы, мэтазгодна ва ўсіх варыянтах кантрольных работ па спецыяльных дысцыплінах прадумаць магчымасць уключэння невялікіх заданняў з розных раздзелаў праграмы. Неабходна, на нашу думку, мяняць гэтыя заданні з улікам канкрэтных тыпаў бібліятэк, у якіх працуюць студэнты-завочнікі, а таксама прадугледжваць выкананне заданняў індывідуальнага характару.

Практыка апошніх год паказвае, што ў міжсесіённы перыяд студэнты-завочнікі вельмі рэдка звяртаюцца да выкладчыкаў за кансультацыямі па пытаннях, якія ўзнікаюць пры выкананні кантрольных работ /выключэнне складаюць мінчане/. Большасць з іх карыстаюцца дапамогай сваіх калег па рабоце ці супрацоўнікаў іншых бібліятэк. Аб гэтым сведчаць адказы студэнтаў. Так, пастаянна да паслуг работнікаў бібліятэк звяртаюцца 22,2% апытаных, у цяжкіх выпадках -- 62,2%, і толькі 14,8% студэнтаў выконваюць усе заданні самастойна. Неабходна адзначыць, што за дапамогай да супрацоўнікаў сваёй і іншых бібліятэк звяртаюцца студэнты, якія працуюць у розных тыпах бібліятэк, незалежна ад пасады і працоўнага стажу. У гэтай сувязі заслугоўвае ўвагі практыка правядзення дня завочніка, якую, на наш погляд, неабходна весці далей; пры гэтым неабходна загадзя інфармаваць студэнтаў аб магчымасці атрымаць у гэты дзень кансультацыі па кантрольных работах. Як ні парадаксальна, але на пытанне анкеты: «Якія цяжкасці ўзнікаюць у Вас пры выкананні кантрольных работ па спецыяльных дысцыплінах?»-- больш за палову адказаў /56,8%/ прыпадае на варыянт «адсутнічае неабходная літаратура». Становішча з вучэбнай літаратурай, а тым больш з іншымі матэрыяламі, якія рэкамендаваны для выканання кантрольных работ па спецыяльных дысцыплінах, вельмі складанае, таму што набываецца гэтая літаратура бібліятэкамі ў адным-двух экземплярах. Матэрыялы ж лекцый, метадычныя дапаможнікі, якія выдаюцца кафедрамі факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, наогул не трапляюць у фонды многіх, нават буйных, бібліятэк рэспублікі. Адказваючы на пытанне: «Якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльныя часопісы Вы чытаеце?»-- 63% рэспандэнтаў адзначылі часопіс «Бібліятэка»; 21% апытаных не чытаюць ніводнага з названых часопісаў, пры гэтым адзначаюць, што не маюць іх у фондах бібліятэк, якімі карыстаюцца. Пэўны інтарэс выклікаюць адказы студэнтаў-завочнікаў на пытанне анкеты :«Ці дапамагае выкананне кантрольных работ па спецыяльных дысцыплінах Вашай практычнай дзейнасці?» Станоўча на гэтае пытанне адказалі 70,3% рэспандэнтаў. З ліку апытаных студэнтаў 83,9% лічаць найбольш цяжкай кантрольную работу па курсу «Бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры».

Вынікі даследавання сведчаць аб тым, што адной з задач выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін з'яўляецца дыферэнцыраваны падыход пры распрацоўцы заданняў для кантрольных работ. Неабходна вырашаць пытанні пераемнасці, збліжэння крытэрыяў ацэнкі якасці кантрольных работ, магчымасці напісання на іх аснове курсавых работ і інш. Для гэтага патрэбны намаганні ўсіх выкладчыкаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Хаддад Набіль,
аспірант

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПА КУРСУ «БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КАТАЛОГІ» Ў ДАМАСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

У кожнай навучальнай установе ёсць свае асаблівасці і праблемы ў развіцці творчых здольнасцей студэнтаў, у фарміраванні спецыялістаў. Ёсць свае асаблівасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і на бібліятэчным аддзяленні літаратурнага факультэта Дамаскага універсітэта.

Адным з асноўных спецыяльных прадметаў, які вывучаюць студэнты гэтага аддзялення, з'яўляецца прадмет «Бібліятэчныя каталогі». Праграма па гэтаму курсу была састаўлена не спецыялістамі. Менавіта таму ў гэтай праграме сустракаюцца некаторыя недакладнасці. На жаль, практычным занятках там не надаецца пэўнай увагі. Ва універсітэце няма ніводнай спецыяльнай кафедры ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі, ніводнай абсталяванай аўдыторыі для правядзення лабараторных заняткаў. Таму выкладчыкам па курсу «Бібліятэчныя каталогі» прыходзіцца вырашаць некаторыя праблемы. Пэўную частку заняткаў выкладчыкі праводзяць у бібліятэках.

У час практычных заняткаў студэнты першага курса не толькі знаёмяцца з бібліятэкай, але і вучацца карыстацца каталогам і алфавітна-прадметным паказальнікам. Значная ўвага ўдзяляецца бібліяграфічнаму апісанню дакументаў. На аснове падабраных крыніц у бібліятэцы праводзяцца практычныя заняткі па апісанню. Студэнтам падабаецца, калі заняткі праводзяцца ў бібліятэцы. Звычайна пасля такіх заняткаў студэнты лепш валодаюць практычнымі ведамі і лягчэй успрымаюць тэарэтычныя веды ў галіне каталагізацыі. І самае галоўнае, у час гутаркі са студэнтамі высвятляецца, што пасля правядзення заняткаў у бібліятэцы ў іх узнікае сапраўднае ўяўленне аб сваёй прафесіі і павялічваецца цікавасць да яе. У адрозненне ад студэнтаў старшых курсаў, першакурснікі сталі адносіцца да ўсіх відаў заняткаў больш адказна; яны стараюцца засвоіць тэарэтычныя веды, каб выкарыстаць іх у практычнай рабоце.

Для студэнтаў 2-га курса методыка правядзення практычных заняткаў іншая. Па-першае, студэнты самастойна, па ўласнаму жаданню, выбіраюць тэму. Па гэтай тэме яны падбіраюць звыш 50 найменняў кніг. Пасля гэтага апісваюць усе кнігі ў адпаведнасці з дзяржаўным стандартам па бібліяграфічнаму апісанню (пад загалоўкам або пад назвай). Пасля апісання карткі аддаюць на праверку выкладчыку, а на аснове падабраных па тэме дакументаў пішуць рэферат або выступаюць з дакладам. У час дыскусіі студэнты